# Журналістыка

П. М. БАРАНОЎСКІ

## ГАЗЕТА КЛІКАЛА ДА БАРАЦЬБЫ

Вывучэнне дзейнасці друкаваных бальшавіцкіх органаў паказвае, што кожны з іх мае сваю яркую гісторыю, сваё непаўторнае аблічча. Разам з тым, кожны такі орган мае і агульныя рысы, характэрныя для ўсіх партыйных газет: яны не толькі адлюстроўваюць падзеі часу, але і актыўна ўздзейнічаюць на іх развіццё, фарміруюць грамадскую думку, клічуць да пэўных дзеянняў, згуртоўваюць працоўных на барацьбу за ажыццяўленне камуністычных ідэалаў.

Газета «Минский пролетарий» выходзіла на працягу ўсяго аднаго месяца. Тым не менш яна займае адметнае месца ў гісторыі друку і уяўляе вялікую цікавасць для даследчыкаў. Аналіз зместу газеты дае магчымасць аднавіць малюнак жыцця і барацьбы мінчан у адзін з самых напружаных перыядаў грамадзянскай вайны. Нельга таксама не звярнуць увагу на формы і метады асвятлення важнейшых палітычных пытанняў, якія былі выкарыстаны рэдакцыяй газеты для мабілізацыі насельніцтва горада Мінска на барацьбу з інтэрвентамі і ўнутранай контррэвалюцыяй.

Выхад газеты звязаны з наступнымі акалічнасцямі. У канцы лютага 1919 года, згодна рашэнню I Усебеларускага з'езда Саветаў і з'езда Саветаў Літвы, дзве савецкія рэспублікі зліліся ў адзіную Савецкую Літоўска-Беларускую Сацыялістычную Рэспубліку — Літбел. 27 лютага 1919 года ў Вільні адбылося сумеснае пасяджэнне ЦВК Саветаў Літвы і Беларусі, на якім былі распрацаваны ўмовы аб'яднання. У сакавіку былі створаны адзіны ЦВК ССР Літвы і Беларусі і адзіны ўрад. Аб'яднаны з'езд кампартыі Літвы і Беларусі, які адбыўся 4—6 сакавіка 1919 года ў Вільні, прыняў рашэнне газету «Звезда» з № 395 лічыць органам ЦК КП(б) Літвы і Беларусі. З пераездам рэдакцыі газеты ў Вільню ўзнікла неабходнасць у стварэнні новага друкаванага органа бальшавікоў у Мінску. Ім і з'явілася газета «Минский пролетарий» — орган Мінскага Савета рабочых і чырвонаармейскіх дэпутатаў і губваенрэўкома.

Першы нумар газеты выйшаў 2 красавіка 1919 года (некаторыя даследчыкі памылкова лічаць датай выхада — 1 красавіка). У праграмным артыкуле «Наша газета» ўказваецца, што новая газета павінна сабой замяніць для Мінскага пралетарыята «Звезду». «Мэта нашай газеты — быць органам перадавога пралетарыята горада Мінска, выразнікам яго спадзяванняў, імкненняў і чарговых задач у справе сацыялістычнага будаўніцтва».

Газета выходзіла штодзённа на чатырох старонках фармата «Правды». У кожным нумары побач з артыкуламі на тэму грамадска-палітычнага жыцця давалася грунтоўная тэлеграфная інфармацыя «Радыёграмы РОСТА». Тэлеграмы групаваліся пад рубрыкамі: «Па Расіі», «На Украіне», «Па Беларусі і Літве». Штодзённа друкавалася аператыўная зводка аб ходзе ваенных дзеянняў на розных франтах. З іншых аддзелаў і рубрык адзначым «Партыйнае жыццё», «Рабочае жыццё», «Эканамічная старонка», «Мясцовае жыццё». Вялікае месца ў «Минском пролетарии» займаюць дэкрэты і распараджэнні ўрада, а таксама пастановы мясцовых кіруючых органаў. Газета пастаянна змяшчала мясцовую інфармацыю, заметкі і карэспандэнцыі па пытаннях партыйнага жыцця. Усе матэрыялы га-

зеты маюць адну агульную рысу: яны так ці інакш звязаны са становішчам на фронце, з задачамі арганізацыі надзейнага адпору ворагу. Пастаянна асвятляўся ход мабілізацыі на фронт камуністаў — членаў Мінскай партарганізацыі, а таксама перадавых рабочых.

Кожны нумар газеты заклікаў камуністаў, чырвонаармейцаў, працоўных горада да пільнасці. Перад савецкімі і партыйнымі органамі, гаварылася ў артыкуле «Партыйныя прыліпалы» (19 красавіка), стаіць задача звярнуць увагу на кожнага камуніста і адказнага работніка, прааналізаваць іх удзел у барацьбе з інтэрвентамі і контррэвалюцыяй.

Фактычна газета ў цэлым стала адзіным моцным заклікам да барацьбы супраць інтэрвентаў. Шмат увагі ўдзяляла рэдакцыя пытанням умацавання Чырвонай Арміі. Нумар газеты за 5 красавіка прысвечаны ідэйна-палітычнай загартоўцы байцоў. У «Пісьме да чырвонаармейцаў» гаварылася, што белагвардзейцы вядуць шкодную прапаганду, арганізоўваюць антысавецкія сілы на барацьбу супраць народнай улады. Як характэрная і яскравая ілюстрацыя да гэтай важнай праблемы ў газеце надрукаваны артыкул аб выступленні так званага «стракапытаўскага» мяцяжу. Адначасова газета ўшанавала памяць загінуўшых у Гомелі рэвалюцыянераў.

Другое «Пісьмо да чырвонаармейцаў» растлумачвае перажываемы Савецкай Расіяй бягучы момант. Аўтар каменціруе рэзалюцыю, прынятую 3 красавіка Маскоўскім Саветам рабочых і чырвонаармейскіх дэпутатаў. «Савецкая рэспубліка, — гаворыцца ў гэтай рэзалюцыі, — у цяжкай і слаўнай барацьбе, якую яна вядзе наперадзе ўсіх народаў, уступае ў самы цяжкі перыяд свайго жыцця»[1]. Цяжкасці Савецкай улады былі звязаны з барацьбой на Усходнім фронце, а таксама з небяспекай наступлення белапалякаў.

Вялікае месца адводзіла газета выкрыццю лозунга контррэвалюцыянераў «Далоў вайну». У нумары за 5 красавіка апублікавана «Пісьмо да чырвонаармейцаў» за подпісам Пётр Вавілаў. Яго асноўная думка — не «далоў вайну», а «няхай жыве свяшчэнная грамадзянская вайна працоўных супраць прыгнятальнікаў».

У «Тэзісах ЦК РКП(б) у сувязі са становішчам Усходняга фронту» (11 красавіка 1919 года) падкрэслівалася рашаючае значэнне гэтага фронту. Газета «Минский пролетарий» выступіла з шэрагам матэрыялаў, якія растлумачвалі, чаму неабходна неадкладна мабілізаваць усе сілы на барацьбу супраць Калчака. «Камуністы, па месцах!» — заклікала газета. Камуністычная партыя аб'явіла мабілізацыю на фронт 50 % сваіх членаў, другая палова павінна была абараняць тыл ад унутраных ворагаў. Гэты лозунг натхняў працоўных на актыўную барацьбу, наперадзе ішлі камуністы.

Не паспеў адгучаць адзін заклік, як «Минский пролетарий» аб'явіў новы кліч: «Камуністы, да зброі!» Гэта было 30 красавіка, калі ўзнікла неабходнасць арганізаваць абарону горада ад белапалякаў.

Як вядома, 1919 год — гэта не толькі час грамадзянскай вайны і ўзброенай абароны ўсёй Савецкай краіны, але таксама і перыяд вялікай работы ў дзяржаўным будаўніцтве. Таму «Минский пролетарий» шырока асвятляў работу савецкіх органаў у галіне гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. У артыкуле «Чарговыя задачы» (12 красавіка) гаварылася аб неабходнасці засеяць прыгарадныя палі. А гэтаму перашкаджалі шматлікія акалічнасці: не хапала рабочых рук, гаспадарчых прылад, коней, а галоўнае, было вельмі мала насення. Рэдакцыя заклікала любымі сродкамі пераадолець гэтыя цяжкасці. Акрамя таго, указвала далей газета, гараджане павінны прыйсці на дапамогу сялянам, стварыць гарадскія зямельныя арцелі для развіцця агародніцтва і садаўніцтва (13 красавіка). У перыяд небяспекі замежнай інтэрвенцыі ў гэтым бачыўся адзін з фактараў вырашэння праблемы забеспячэння насельніцтва і арміі харчаваннем.

У нумары за 9 красавіка надрукавана заметка аб падрыхтоўцы да адкрыцця ў Мінску дзяржаўнага універсітэта. Газета паведамляе, што «на гэтым тыдні выязджае ў Маскву дэлегацыя ў складзе прафесара Карскага і інш. для высвятлення некаторых пытанняў, якія датычаць адкрыцця універсітэта. Пасля звароту дэлегацыі будзе названы тэрмін прыёму заяў ва універсітэт, таму што асноўная падрыхтоўчая работа ўжо праведзена. Закончаны работы па арганізацыі фізіка-матэматычнага факультэта. Прыняты меры да абсталявання сельскагаспадарчай фермы і лясной дачы для агранамічнага факультэта»[2]. Пры універсітэце з 1 мая павінны былі працаваць падрыхтоўчыя курсы для юнакоў і дзяўчат, якія не мелі сярэдняй адукацыі, але жадалі паступіць ва універсітэт. Гэты артыкул «Минского

пролетария» паказаў сілу бальшавіцкай партыі і Савецкага ўрада, якія, нягледзячы на цяжкае ваеннае становішча рэспублікі, стваралі першую навуковую ўстанову — дзяржаўны універсітэт.

Пад рубрыкай «Эканамічная старонка» змяшчаліся матэрыялы аб прамысловасці Беларусі і Літвы, а таксама асвятляліся пытанні эканамічнага будаўніцтва ў Савецкай Расіі, друкаваліся інфармацыйныя матэрыялы аб ходзе нацыяналізацыі прамысловых прадпрыемстваў.

Выхад апошніх нумароў «Минского пролетария» супаў з часовым наступленнем войск інтэрвентаў на Заходнім фронце. Старонкі газеты ў гэты час насычаны матэрыяламі, якія заклікаюць мабілізаваць усе сілы на хутчэйшы адпор ворагу. Чытаючы цяпер гэтыя матэрыялы, мы выразна адчуваем напружаную абстаноўку тых дзён, думкі і пачуцці людзей ва ўмовах навісшай над сацыялістычнай Айчынай небяспекі.

24 красавіка газета надрукавала інфармацыю «Да становішча на фронце». У ёй гаварылася аб цяжкіх баях за Вільню. «У Вільні чацвёрты дзень ідуць баі. Частка горада і Георгіеўскі праспект у руках Чырвонай Арміі»[3]. Далей указваецца, што Мінску цяпер пагражае непасрэдная небяспека, але падставы для панікі і разгубленасці не павінна быць, сцвярджала газета. У адносінах да контррэвалюцыйных правакацый былі таксама прыняты папераджальныя і дастаткова энергічныя меры.

У Звароце ЦК РКП(б) «Усім партыйным арганізацыям», надрукаваным у газеце 27 красавіка, указваецца, што ЦК РКП(б) прызнаў неабходным прыняць тэрміновыя меры па мабілізацыі ўсіх сіл партыі для абароны рэвалюцыі і яе заваёў. Газета выступіла з артыкулам «Фронт і тыл». У ім аб'ектыўна ацэньваецца становішча, ставяцца канкрэтныя задачы перад Мінскай партарганізацыяй. «Савецкая Расія не раз перажывала цяжкія дні, але, магчыма, не было моманту, калі ўсім заваяванням рабочых і сялян пагражала такая блізкая непасрэдная небяспека, як цяпер... Разбітыя белагвардзейскія банды на поўдні, на Украіне і Доне аб'ядналіся і пагражаюць адрэзаць Савецкую Расію ад запасаў хлеба і асудзіць рабочых і сялян на голад. Падтрыманыя «саюзнікамі» белагвардзейскія польскія войскі перайшлі ў наступленне на Заходнім фронце... Трэба напружыць усе сілы, каб адвесці ўдар белапольскіх войск. Становішча патрабуе мабілізацыі на фронт усіх баяздольных рабочых і сялян, усіх працоўных»[4]. Але гэта толькі адзін бок справы. Газета заклікае не спыняць пачатыя стваральныя работы па будаўніцтву новай Савецкай Расіі, а таксама «змагацца з кожнай спробай, якая можа згасіць дух, унесці смуту і дэзарганізацыю ў рабоча-сялянскія рады». У артыкуле падкрэсліваецца, што цяпер фронт і тыл складаюць адзінае цэлае. Гэта добра разумеюць і ворагі. Яны ўзмацняюць сваю агітацыю супраць Савецкай улады, правакуюць выступленні цёмных сіл і несвядомых элементаў.

30 красавіка газета змясціла паведамленне аб прыездзе ў Мінск урада Літоўска-Беларускай рэспублікі, а таксама аб тым, што надзвычайны з'езд Саветаў Літвы і Беларусі назначаны на 15 мая з парадкам дня: 1. Абарона краіны; 2. Савецкае будаўніцтва на месцах.

Усяго на працягу красавіка 1919 года выйшла 22 нумары «Минского пролетария». У апошнім нумары газеты (30 красавіка) змешчана паведамленне аб тым, што «з заўтрашняга дня ў Мінску пачне выходзіць газета «Звезда». Выхад газеты «Минский пролетарий» спыняецца».

Стварэнне і выхад баявой штодзённай газеты «Минский пролетарий» у найцяжэйшы для Савецкай Расіі перыяд — наступленне Калчака на Усходнім і белапольскіх войск на Заходнім франтах — з'яўляецца вялікай заслугай Мінскай гарадской партыйнай арганізацыі. Газета была нязменнай зброяй у яе руках, з'яўлялася магутным сродкам ідэалагічнага выхавання працоўных, растлумачэння неадкладных задач барацьбы на Заходнім фронце і абароны ўсёй Савецкай краіны, мабілізацыі рабочых і сялян на разгром ворага.

[1] Минский пролетарий. 1919, 5 красавіка.
[2] Там жа. 1919, 9 красавіка.
[3] Там жа. 1919, 24 красавіка.
[4] Там жа. 1919, 27 красавіка.